из процессов медиапотребления (в том числе и рекламы – одного из основных источников финансовых поступлений в медиабизнесе) огромное число конечных потребителей (читателей, зрителей и слушателей), использующих для входа в интернет не стационарный персональный компьютер. Таким образом, создание и последующая поддержка (обновление) специалистами корпорации «NetEase Incorporated» мобильного новостного приложения «NetEase Mobile News Application» для посетителей портала http://www.163.com является примером грамотного распределения и вложения финансовых средств в развитие компании для диверсификации линейки предлагаемых медиапродуктов.

*Литература*

1. Statistical Report on Internet Development in China (January 2017) [Electronic resource]. – 2017. – Mode of access: https://cnnic.com.cn/IDR/ReportDownloads/201706/P020170608523740585924.pdf. – Date of access: 15.07.2017.

**Наталля ЗУБЧОНАК**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ І ПРЭСА: ЭТАПЫ ФАРМІРАВАННЯ

У працэсе гістарычнага развіцця Беларусі аб’ектыўна супалі два працэсы: фарміравання дзяржаўнасці і станаўлення нацыянальнага друку. На розных этапах менавіта гэтыя  аспекты стваралі ідэалагічны фундамент будучай краіны. Нацыянальна-культурныя і дзяржаўныя інтарэсы рэалізаваліся канчаткова толькі ў пачатку 1990-х гг., калі на заканадаўчым узроўні Рэспубліка Беларусь стала дэмакратычнай, суверэннай і незалежнай (27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі).

Падзеі першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі сталі пачаткам новага этапа ў гісторыі Беларусі, яе культуры, літаратуры, журналістыкі. Нацыянальна-дэмакратычны рух спрыяў фарміраванню асноўных прынцыпаў пабудовы беларускай дзяржаўнасці, сцвярджэнню нацыянальнага суверэнітэту нашай краіны. У пачатку XX ст., нягледзячы на складанасці сацыяльна-палітычнага і эканамічнага характару, склаліся ўмовы для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, былі зроблены значныя крокі на шляху вызначэння ідэалогіі дзяржавы. Нестабільнасць грамадска-палітычнай сітуацыі спрыяла дзейнасці разнастайных палітычных плыняў.

У пачатку XX ст. у Беларусі налічвалася каля 30 палітычных партый. Большасць з яіх была заснавана пасля 1905 г. Працэс арганізацыі і дзейнасці палітычных утварэнняў быў вельмі складаным і супярэчлівым. У эпоху рэвалюцыйных змен самадзяржаўе ўсё яшчэ лічыла магчымым абыходзіцца без палітычных партый, без свабод, без незалежнага друку і парламента. Тым не менш, пытанне дзяржаўнага самавызначэння стала самым важным у шэрагу палітычных і эканамічных пераўтварэнняў, а асаблівасцю беларускага нацыянальнага руху ў пачатку XX ст. з’явілася тое, што развіваўся ён пад кіраўніцтвам адной партыі — БСГ, і аднаго выдання – газеты “Наша ніва” (выходзіла з 1906 па 1915 г.), якая заклала традыцыі і сфарміравала асновы беларускай нацыянальнай прэсы.

Грамадска-палітычная і нацыянальна-культурная работа па адраджэнні Беларусі разгортвалася, дзякуючы актыўнай дзейнасці перыядычнага друку, сістэматызацыя якога ажыццяўлялася ў адпаведнасці з агульнымі заканамернасцямі функцыянавання прэсы ва ўсім буржуазным свеце. Развіццё дэмакратычных працэсаў і капіталістычных адносін ўнесла значныя карэктывы ў функцыянаванне прэсы: вызначалася тыпалогія, перыядычнасць выхаду газет і часопісаў. Рэвалюцыйны час садзейнічаў з’яўленню на тэрыторыі Беларусі новага дэмакратычнага інстытута сацыяльнай сувязі – сістэмы перыядычнага друку.

Падзеі Першай сусветнай вайны значна ўскладнілі сітуацыю. Урадам кантралявалася дзейнасць палітычных партый, друкаваных органаў. На беларускай тэрыторыі размясцілася паўтарамільённая расійская армія. У гэты час на нямецкім баку фронту, у Вільні, у 1916 г. выдаўцамі зачыненай «Нашай нівы» была заснавана газета «Homan» з праграмай «федэратыўнае самастойнасці» Беларусі. У 1916 г. Беларусь упершыню выйшла на міжнародную палітычную арэну. І. Луцкевіч і В. Ластоўскі прынялі ўдзел у канферэнцыях народаў свету ў Стакгольме і Лазане, заклікаючы міжнародную супольнасць дапамагчы беларусам рэалізаваць свае правы на пабудову ўласнай дзяржавы.

Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў, ва умовах нямецкай і польскай акупацый (1917-1920 гг.), працягвалася палітычная і культурная дзейнасць па замацаванні асноў беларускай дзяржаўнасці (25 сакавіка 1918 г. абвешчана БНР, 1 студзеня 1919 г. – БССР), нацыянальнай прэсы. Вялікае значэнне для гісторыі друку мае газета “Дзянніца” (1918 г.), якая ўвайшла ў гісторыю як першае савецкае выданне на беларускай мове (рэдактар-выдавец З. Жылуновіч). Вялікую працу ў адстойванні права беларусаў на стварэнне незалежнай дэмакратычнай дзяржавы выконвалі рэдакцыі такіх выданняў, як

“Вольная Беларусь” (1917-1918 гг., рэдактар-выдавец Я.Лёсік) і газет “Звон” (1919) і “Беларусь”(1919-1920 гг.), у выданні якіх прымаў самы актыўны ўдзел Я.Купала.

Аб’ектыўныя гістрарычныя абставіны на доўгі тэрмін адлажылі завяршэнне важнага працэсу па канчатковым фарміраванні нацыянальнай дэмакратычнай дзяржавы і яе прэсы. Тым не менш, ва ўмовах савецкай улады дадзеная праца таксама актыўна ажыццяўлялася. Сапраўднымі сімваламі беларускага нацыянальнага друку сёння з’яўляюцца такія выданні, як газета “Звязда” (выходзіць з 1917 г., з 1927 г. – па-беларуску), газета “Чырвоная змена” (выходзіць з 1921 г., сёння дадатак да “Звязды”), “Сельская газета” (выходзіць з 1921 г. як “Беларуская вёска”), часопіс “Полымя” (выходзіць з 1921 г.), газета “СБ Беларусь сегодня” (выходзіць з 1927 г. як “Рабочий”), газета “Літаратура і мастацтва” (выходзіць з 1932 г.) і многія іншыя.

Такім чынам, галоўным вынікам працы беларускай інтэлігенцыі на працягу XX ст. было заснаванне першых нацыянальных газет, якія праклалі шлях цэламу шэрагу іншых выданняў на роднай мове. Беларуская прэса паступова набывала адметнасць і актыўна выконвала сваю галоўную задачу па фарміраванні грамадскай свядомасці, нацыянальна-дэмакратычнай ідэалогіі, традыцый беларускай журналістыкі і літаратуры.

*Літаратура*

1. Зубчонак, Н.А. Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906-1916): дапам… / Н.А. Зубчонак. – Мінск: БДУ, 2010. – 99 с.

2. Беларуская журналістыка: падручнік / А.Г. Слука. – Мінск: БДУ, 2011.– 447 с.

**Алексей ИНДРИКОВ**

*Российская академия народного хозяйства и государственной службы при Президенте Российской Федерации*

## ИСТОРИЯ ЕВРОПЫ В СООБЩЕСТВАХ СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЕЙ

История Европы по-прежнему вызывает стабильный интерес у российской аудитории. История Европы тем более интересна именно в наши дни, когда противостояние идеологических моделей общественного развития Запада и Востока вступает в очередную фазу, острота которой усугублена развитием интернет-технологий, мощным присутствием обсуждения этих моделей в социальных сетях. В условиях уве-